# Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь

(Матэрыялы «круглага стала», які адбыўся 22 верасня 2006 г.
у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі*)

***Забаўскі Мікалай Міхайлавіч** — дэкан гістарычнага факультэта, дырэктар Навукова-асветніцкага цэнтра БДПУ імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук, прафесар*



Сёння ад вышэйшых навучальных установ патрабуецца падрыхтаваць высокаадукаваных спецыялістаў. Неабходна стварыць умовы для фарміравання студэнта як сацыяльна актыўнай асобы, якая вызначаецца патрыятычнай свядомасцю, грамадзянскай адказнасцю, навуковым светапоглядам, высокай духоўнасцю і культурай. Гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка рыхтуе педагагічныя кадры па спецыяльнасцях "Гісторыя. Замежная мова", "Гісторыя. Сацыяльна-палітычныя дысцыпліны", "Гісторыя. Рэлігіязнаўства". Захоўваюцца традыцыйныя і ствараюцца новыя навуковыя школы, удасканальваюцца ўсе звёны вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай работы. У склад факультэта ўваходзяць 6 кафедраў: гісторыі Беларусі (загадчык прафесар А.М.Люты), славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі (загадчык прафесар А.П.Жытко), гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя (загадчык прафесар У.В.Тугай), новай і навейшай гісторыі (загадчык прафесар Г.А.Космач), дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі (загадчык дацэнт І.І.Багдановіч), германа-раманскага мовазнаўства (загадчык дацэнт Н.М.Джа-гарава).

Адным з галоўных арыенціраў у нашай рабоце з'яўляецца дзяржаўная ідэалогія, творчае выкарыстанне палажэнняў якой дапамагае ўзняць на якасна новы ўзровень выхаванне маладога пакалення. Распрацаваны і паспяхова ўкараняюцца перспектыўныя планы ідэалагічнай і ідэйна-выхаваўчай работы, праводзяцца спецкурсы "Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы" і "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны".

Вядзецца ўдасканаленне сістэмы навуковай работы, вучэбных планаў, лекцыйных і практычных курсаў, напаўненне іх новым якасным зместам. Так, супрацоўнікі кафедраў гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі, славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі разам з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі ажыццяўляюць распрацоўку праграмы фундаментальных даследаванняў "Гісторыя і культура" і іншых.

Супрацоўнікі кафедры гісторыі Беларусі працуюць над праблемамі гісторыі сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны, фарміравання буржуазнага рынку і класаў у буржуазным грамадстве. Аб існаванні гістарычнай школы па айчыннай гісторыі другой паловы XVIII—XIX ст. можна меркаваць па дзейнасці загадчыка кафедры Беларусі А.М.Лютага. Яму належаць шматлікія навуковыя публікацыі, манаграфіі, якія тычацца асноўных праблем генезісу капіталізму ў Беларусі. Прафесары А.М.Люты, М.К.Сакалоў, М.М.Забаўскі, дацэнты З.І.Канапацкая, А.Э.Лютая, Л.Л.Шкуцько, А.Ф.Вялікі і іншыя вывучаюць праблемы палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Даследаванні грунтуюцца на галоўных прынцыпах метадалогіі: гістарызму аб'ектыўнасці і цэннаснага падыходу. Гэта дазволіла на аснове новых крыніц правесці аб'ектыўны аналіз развіцця эканомікі і сацыяльных адносін, паказаць асаблівасці развіцця капіталізму ў Беларусі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Па выніках даследаванняў выкладчыкаў кафедры ў 2006 г. надрукавана 9 навуковых артыкулаў.

Пытанні арганізацыі навуковых даследаванняў і выдання вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў знаходзяцца ў цэнтры ўвагі кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі. Неабходна адзначыць навуковыя напрацоўкі, школьныя падручнікі аднаго са старэйшых супрацоўнікаў БДПУ прафесара В.М.Фаміна. Пад яго кіраўніцтвам абаронены дзесяткі доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый і можна гаварыць аб тым, што ім створана навуковая школа па айчыннай гісторыі. Упершыню ў краіне супрацоўнікі кафедры выдалі "Праграму па гісторыі славянскіх народаў". Дацэнты Н.Д.Ляўковіч, У.С.Пуцік і ст. выкладчык С.П.Барадзін, падрыхтавалі праграмы па дысцыплінах рэлігійнага цыкла (гісторыі хрысціянства, гісторыі рэлігіі старажытных цывілізацый).

Супрацоўнікі кафедры разам з іншымі выкладчыкамі факультэта ўдзельнічаюць у напісанні вучэбных дапаможнікаў і праграм для агульнаадукацыйных школ. Прафесары В.М.Фамін, А.П.Жытко, М.М.Забаўскі, дацэнты С.А.Талмачова і У.С.Пуцік вядуць работу над вучэбна-метадычным дапаможнікам для студэнтаў гістарычных факультэтаў ВНУ "Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму" ў 5-ці частках. Пад рэдакцыяй А.П.Жытко ўжо выйшлі дзве часткі дапаможніка. В.М.Фамін выдаў вучэбны дапаможнік для 10-га класа "Гісторыя Беларусі, 1945—2005 гг.". А.П.Жытко ўдзельнічаў у напісанні падручніка для

вучняў 4-га класа "Мая Радзіма — Беларусь". Творча працуюць над сваімі тэмамі дацэнты І.А.Груцо, В.Ц.Ісаеў, В.Р.Федарасава. І.Груцо вывучае гісторыю руска-французскай вайны 1812 г. у Беларусі. Ён сабраў значны архіўны матэрыял з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, апублікаваных дакументальных крыніц, мемуараў расійскіх і французскіх удзельнікаў вайны 1812 г. Гэта дазволіла ўстанавіць месцы асноўных баталій на тэрыторыі Беларусі, якія разгортваліся ў 1812 г. В.Ц.Ісаеў праводзіць даследаванне грамадска-палітычнага і культурнага жыцця ў пасляваенны перыяд. Ён устанавіў, што да 1953 г. адбываўся працэс умацавання таталітарнага рэжыму ў СССР. Гэта вылілася ў шматлікія дэпартацыі, парушэнні канстытуцыйнай законнасці. Разам з тым наглядаліся і станоўчыя бакі развіцця савецкай дзяржавы ў галіне эканомікі і культуры. В.Р.Федарасава вывучае праблему развіцця навукі і асветы ў Расіі ў XVIII—першай палове XIX ст., якая з'яўляецца часткай тэмы "Руская культура XVIII—першай паловы XIX ст.". Выкладчыкамі кафедры ў 2006 г. выдадзена 5 вучэбных дапаможнікаў для ВНУ і школ, 25 артыкулаў і 9 тэзісаў матэрыялаў рэспубліканскіх канферэнцый.

Асноўная ўвага супрацоўнікаў кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя была сканцэнтравана на вывучэнні праблем метадалогіі гісторыі, у прыватнасці метадаў пабудовы навуковых і адукацыйных гістарычных ведаў. Дацэнт М.І.Мініцкі выдаў па гэтай тэме манаграфію і шэраг навуковых артыкулаў, падрыхтаваў праграму і вучэбныя дапаможнікі па гісторыі старажытнага свету для 5-га класа.

Падрыхтаваны вучэбныя дапаможнікі для вучняў і студэнтаў. Прафесар У.В.Тугай з'яўляецца аўтарам вучэбных дапаможнікаў для 9—10-х класаў "Сусветная гісторыя навейшага часу", "Старажытныя германцы: Сярэднія вякі". Выдадзены "Нарысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краін Усходу ў XVI—першай палове XIX ст." (У.У.Куніцкі), "Практыкум па гісторыі сярэдніх вякоў" (А.М.Сурта).

У 2006 г. выкладчыкі кафедры пачалі распрацоўку тэмы "Этнакультурныя працэсы ў Еўропе і фарміраванне беларускай народнасці (II ст. да н.э. — XVII ст.)". Асноўная ўвага надаецца вывучэнню праблем этнічнай гісторыі нашага геаграфічнага арэалу —Усходняй Еўропы.

Неабходна адзначыць эфектыўную працу кафедры новай і навейшай гісторыі. Вядучым германістам Беларусі з'яўляецца загадчык кафедры прафесар Г.А.Космач. Пад яго кіраўніцтвам абаронены некалькі кандыдацкіх дысертацый, некаторыя яго вучні працуюць над доктарскімі дысертацыямі. На кафедры распрацоўваецца тэма: "Краіны Захаду: асноўныя праблемы сацыяльнага і палітычнага развіцця ў XX стагоддзі". Прафесары І.Р.Чыкалава, Г.А.Космач, дацэнты П.А.Тупік, А.І.Асіповіч, І.В.Варывончык і іншыя на падставе грунтоўнага аналізу падрыхтавалі цікавы для студэнтаў матэрыял пра палітычную эвалюцыю заходніх краін на пачатку XX ст., сацыяльна-палітычны крызіс 1919—1923 ст., пасляваеннае аднаўленне і мадэрнізацыю заходнееўрапейскага грамадства ў 1950-я—1970-я гг.

Г.А.Космач з'яўляецца сааўтарам праграм і вучэбных дапаможнікаў па сусветнай гісторыі навейшага часу для 8—11-х класаў. Дацэнт Н.Р.Кошалева сааўтар вучэбных праграм, дапаможнікаў і падручнікаў па сусветнай гісторыі новага часу для 7-га і 8-га класаў. Яна сумесна з Г.А.Космачам прымала ўдзел у распрацоўцы канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі, сутнасць якой зводзіцца да разумення адзінства айчыннай і сусветнай гісторыі, прызнання гісторыі Беларусі як састаўной часткі еўрапейскай гісторыі.

Выкладчыкі кафедры выдалі 2 вучэбныя дапаможнікі для сярэдніх школ і 24 артыкулы, а таксама зборнік "Новая и новейшая история Европы и США: проблемы, поиски, исследования".

Супрацоўнікі кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін дацэнты І.І.Багдановіч, М.Ф.Бандзелікаў, Дз.У.Дубінін, Л.У. Калядзінскі, старшыя выкладчыкі В.В.Навіцкі, В.І.Мярзляк працуюць над тэмай "Навукова-метадычныя аспекты рэалізацыі дзейснага падыходу ў выкладанні гісторыі і дапаможных гістарычных дысцыплін". Апублікаваны вучэбныя праграмы для ВНУ па спецыяльнасцях "Гісторыя. Замежная мова", "Гісторыя. Сацыяльна-палітычныя дысцыпліны", "Гісторыя. Рэлігіязнаўства", у якіх знайшлі адлюстраванне тэарэтычны і факталагічны зместы дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі, а таксама вызначаныя спосабы дзейнасці, уменні і навыкі, неабходныя для практычнага прымянення атрыманых ведаў, пошуку і выкарыстання адпаведнай навуковай інфармацыі. Выкладчыкі кафедры апублікавалі 2 вучэбныя дапаможнікі, 22 навуковыя артыкулы. Вынікі даследаванняў апрабіраваны на 2-х міжнародных і 9-ці рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях.

Кафедра германа-раманскага мовазнаўства рыхтуе спецыялістаў-гісторыкаў, якія валодаюць англійскай, нямецкай і французскай мовамі. Штогод дыпломы па спецыяльнасці "Гісторыя. Замежная мова" атрымліваюць больш за 100 студэнтаў.

Выкладчыкі кафедры вядуць актыўную працу па стварэнні вучэбных модуляў на аснове тыпавых (базавых) праграм, па аналізу існуючых праграм і методык выкладання замежнай мовы, стварэнню тэарэтычнай базы модульнага навучання, прымаюць актыўны ўдзел у эксперыменце па крэдытна-рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў. Выдадзены 2 вучэбна-метадычныя дапаможнікі для ВНУ (аўтары А.У.Чурай, С.У.Кунец, А.Ф.Пацына, В.В.Грамыка).

На факультэце надаецца вялікая ўвага вывучэнню культурна-гістарычнай спадчыны для аказання дапамогі грамадству, у першую чаргу моладзі, у сацыяльнай і псіхалагічнай адаптацыі ва ўмовах праяў сацыякультурнага крызісу, міжнацыянальных і міжканфесіянальных канфліктаў у свеце.

У сувязі з карэннымі зменамі ў жыцці грамадзян Рэспублікі Беларусь, рэформамі ў галіне адукацыі,

са шматвектарнай знешняй палітыкай нашай краіны навукоўцаў, педагогаў, кіраўнікоў адукацыі цікавяць праблемы нацыянальнай гісторыі і культуры, а таксама ўмовы фарміравання культурных і рэлігійных традыцый беларускага і іншых народаў. У гістарычным мінулым рэлігія часта з'яўлялася галоўным фактарам развіцця дзяржаўнасці, ідэалогіі і культуры.

У Беларусі пражывае больш за 130 нацыянальнасцей, сярод якіх істотны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё і грамадска-палітычнае жыццё краіны аказалі рускія, палякі, яўрэі, татары і інш. Яны прынеслі з сабой не толькі ўласную культуру, але і сваю рэлігію і моцна ўздзейнічалі на розныя бакі жыцця беларускага народа. Без аналізу гісторыі рэлігіі і сучасных міжканфесіянальных праблем нельга разглядаць ні палітычны, ні сацыяльны статусы насельніцтва Рэспублікі Беларусь у сучасных умовах.

Павышэнне сацыяльнай актыўнасці моладзі абумоўлівае неабходнасць знаёмства вучняў сярэдняй школы з асновамі ведаў па гісторыі рэлігіі. Канцэптуальнай асновай курса "Рэлігіязнаўства" павінна стаць палажэнне аб тым, што ў сусветнай і айчыннай гісторыі і культуры існуюць дзве традыцыі: рэлігія і атэізм, якія выступаюць як светапоглядныя альтэрнатывы ў фарміраванні асобы і грамадства.

Асноўныя кампаненты курса павінны скласці: **гісторыя рэлігій,** якая прадугледжвае раскрыццё заканамернасцей трансфармацыі рэлігіі ў сувязі са зменамі ў эканамічным і сацыяльным жыцці чалавецтва; **узаемаадносіны рэлігіі і дзяржавы** — з мэтай аналізу дэтэрмінацыі ў развіцці дзяржаў і царквы, аналіз адносін дзяржаўнай улады і рэлігійных інстытутаў у гісторыі; **філасофія рэлігіі** — для азнаямлення з філасофскімі падыходамі да асноўных структурных кампанентаў рэлігіі ў гістарычнай перспектыве; **узаемаадносіны рэлігіі і палітыкі, рэлігіі і навукі, рэлігіі і мастацтва** і інш. Важна акцэнтаваць увагу на **псіхалогіі рэлігіі**, якая разглядае ўздзеянне хрысціянства, іудаізму, будызму, ісламу, індуізму і інш. на фарміраванне псіхікі чалавека. Неабходна аналізаваць уплыў рэлігіі на светапогляд і этычныя нормы паводзін сучаснага чалавека.

На кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі распрацаваны адпаведныя курсы і падрыхтаваны 14 тыпавых праграм па спецыяльнасці "Гісторыя. Рэлігіязнаўства", якія з'яўляюцца базай для распрацоўкі вучэбных курсаў у ВНУ Рэспублікі Беларусь. Выкладчыкі факультэта на працягу дзесяцігоддзя вядуць падрыхтоўку гісторыкаў-рэлігіязнаўцаў.

Але моладзі неабходны звесткі не толькі аб традыцыйных канфесіях. Новай з'явай у апошнія дзесяцігоддзі сталі і нетрадыцыйныя рэлігіі, стварэнне значнай колькасці рэлігійных аб'яднанняў. У сувязі з гэтым неабходна рыхтаваць спецыялістаў, якія маглі б кваліфікавана вызначаць іх сутнасць, ступень уплыву на грамадства і рабіць прагноз развіцця грамадскай думкі. Вырашэнне канфесіянальных праблем мае стратэгічнае значэнне і ў каардынацыі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Традыцыйна навукова-даследчай работай ахоплены практычна ўсе студэнты гістарычнага факультэта, асабліва актыўна яна праводзіцца на старшых курсах. Асноўнымі формамі работы, якія станоўча зарэкамендавалі сябе на працягу многіх гадоў, з'яўляюцца:

— падрыхтоўка навуковых паведамленняў на спецсемінарах;

— напісанне курсавых і дыпломных работ;

— падрыхтоўка конкурсных навуковых работ;

— падрыхтоўка дакладаў і паведамленняў на навуковых канферэнцыях;

— работа ў вучэбных навукова-праблемных групах.

Новай і цікавай формай работы на факультэце з'яўляюцца навукова-праблемныя групы. Іх у нас 21, па 10—15 студэнтаў, з якімі па вызначанай актуальнай праблеме ажыццяўляецца разнастайная навуковая і пошукавая работа: праводзяцца практычныя заняткі, наладжваюцца дыскусіі па праблемных пытаннях гістарыяграфіі, праходзіць абмеркаванне даследчыцкіх прац і сумесная выпрацоўка крытэрыяў іх ацэнкі. Пры гэтым выказваюцца розныя погляды і меркаванні, што дапамагае студэнтам не толькі замацаваць назапашаныя веды, але і набыць навыкі самастойнага аналітычнага мыслення.

Па выніках работы многія студэнты выступілі на навукова-практычных канферэнцыях. У 2006 г. апублікавана 11 артыкулаў, 3 працы накіраваны на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх работ.

У 2006 г. студэнты гістарычнага факультэта ўдзельнічалі ў 15 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях і семінарах у Рэспубліцы Беларусь, Расійскай Федэрацыі, Літве і Польшчы. Праведзена традыцыйная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў факультэта, у якой узялі ўдзел 93 студэнты, 42 з іх выступілі з дакладамі і паведамленнямі.

Студэнты першага курса далучаюцца да навукова-даследчыцкай дзейнасці з дапамогай практык, перш за ўсё краязнаўчай, этнаграфічнай і музейна-архіўнай. Стымулам да заняткаў навукова-даследчай работай з'яўляецца і сістэма прэміравання. У бягучым годзе прэміямі адзначаны 35 студэнтаў, акрамя таго, многія атрымалі граматы і падзякі.

Сведчаннем выніковасці навукова-даследчыцкай работы на факультэце з'яўляецца тое, што ў 2006 г. пяці студэнтам факультэта прысуджаны імянныя стыпендыі (дзве — спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дзве — імя Ф.Скарыны і адна — Савета БДПУ).

*(Працяг будзе.)*